# «НЕ ПАКІДАЦЬ ГРАМАДСКАЙ ВАРТЫ...»

**21 сакавіка ў Гродне адзначылі Сусветны дзень паэзіі.**

Ініцыяванае Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі літаратурна-музычнае свята пад назвай «Паэзія – мой лёс і вырай» сабрала ў зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці паэтаў і аматараў літаратуры рознага ўзросту. У імпрэзе выступілі гродзенскія паэты, члены СПБ: Браніслаў Ермашкевіч, Віктар Кудлачоў, Людміла Шаўчэнка, Анатоль Апанасевіч, Дзмітрый Радзівончык. З уласнымі вершаванымі творамі таксама выступілі: дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая; літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць; літаратуразнавец, літаратурны крытык, фалькларыст Руслан Казлоўскі; публіцыст, краязнавец Аляксандр Сявенка; пераможца IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Адкрыццё года», паэтэса Кацярына Каламійцава-Ігнацюк. З горада Слоніма да нас на свята прыехала паэтэса, аўтар і выканаўца песень Надзея Салейка, а з Ваўкавыскага раёна – беларускі паэт Мікалай Іваноўскі. Акрамя прадстаўнікоў СПБ, слова атрымалі члены Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея», паэтэсы Таццяна Лугавая, Людміла Мілоста, паэтэсы-аматаркі Людміла Нідрагайлава і Ірына Полудзень. У ролі вядучай выступіла старшыня ГрАА СПБ, вядомая беларуская паэтэса Людміла Кебіч (*на фота*). Як адзначыла кіраўнік Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, «Гродзенская пісьменніцкая арганізацыя першай у рэспубліцы пачала адзначаць Дзень паэзіі. Да гэтага свята нашы аўтары заўсёды стараюцца прымеркаваць значныя падзеі, прыемныя падарункі. Некалькі разоў у Сусветны дзень паэзіі ўзнагароджваліся пераможцы галоўнага літаратурнага спаборніцтва Гродзеншчыны – Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі, адбываліся прэзентацыі абласнога літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі». Сёлета вырашана адзначыць пісьменнікаў, якія найбольш актыўна і плённа праявілі сябе ў мінулым годзе».













**Сярод узнагароджаных у Дзень паэзіі – празаік, публіцыст Ірына Фамянкова**

Удзельнікамі парада паэтаў былі прачытаны вершы на беларускай і рускай мовах, для дарослых і дзяцей з грамадзянскай, філасофскай, інтымнай лірыкі. Кожны выступоўца атрымаў порцыю ўвагі і пачуў у свой адрас шчырыя апладысменты слухачоў. Літаратуразнаўца Аліна Сабуць выступіла з прыгожай тэматычнай прамовай да Сусветнага дня паэзіі. Надзея Салейка прачытала верш і праспявала раманс уласнага сачынення. Таксама святочныя музычныя падарункі прысутным прапанавалі юныя спявачкі, навучэнцы Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Вікторыя Іванова, Эмілія Хацук і Ангеліна Жыдзіс, якія на высокім выканаўчым узроўні выканалі песні з рэпертуару папулярных спевакоў. Шчымлівым пачуццём суму адгукнулася ў сэрцах прысутных хвіліна маўчання ў памяць пра паэтаў Прынёмання, якія пайшлі з жыцця.

Лідарам літаратурнай Гродзеншчыны была падкрэслена неабходнасць памятаць запаветы нашых папярэднікаў, класікаў беларускай літаратуры і крочыць па жыцці з арыенцірам на іх. Сапраўдны паэт гатовы адгукнуцца мастацкім словам на надзённыя праблемы, увасобіўшы ў творчасці сваю любоў да Радзімы, да жыцця і людзей. Па словах беларускага паэта Тодара Кляшторнага (1903-1937), сапраўдны паэт – той, хто выкарыстоўвае свой дар у якасці сродку служэння грамадству, тым больш, што гэтага патрабуе эпоха:

Калі ад кожнага ўпарта
Эпоха сёння патрабуе:
Не пакідаць грамадскай варты,
Не пакідаць свае трыбуны…

Пры жаданні сапраўдную паэзію няцяжка распазнаць. Сапраўдная паэзія актыўна працуе на развіццё духоўнага патэнцыялу нашых грамадзян, на іх культурнае і маральнае аблічча; яна смела гаворыць праўду, ірoніяй і мудрасцю народнага фальклору высмейвае заганы, выкрывае недахопы, будуе і ўдасканальвае ўнутраны свет чалавека, чалавека сумленнага і працавітага, сапраўднага грамадзяніна. Нягледзячы на сваю вобразную арыгінальнасць, сапраўдная паэзія простая і зразумелая. Кожны з паэтаў-землякоў упэўнены: калі б увагі да паэзіі з боку людзей было больш, нам усім удалося б пазбегнуць многіх балючых з'яў у нашым агульным беларускім доме. Паэзія, калі яна сапраўдная, можа шмат чаму навучыць. Той факт, што ў школьныя падручнікі па беларускай літаратуры пакуль не ўключаны творы сучасных паэтаў з усіх абласцей Беларусі, а таксама рускамоўных паэтаў Беларусі, можна назваць прыкрым непаразуменнем і гістарычнай несправядлівасцю. Калі вы лічыце, што паэзія вам «па барабану», гэта нагода для спачування. Такое жыццё нельга назваць паўнавартасным. І ці жыццё гэта ўвогуле?

На літаратурна-музычным свяце «Паэзія – мой лёс і вырай» кожны змог дакрануцца да непаўторнага вобраза сучаснай паэзіі горада над Нёманам і Прынёманскага краю, запомніць яе твары, імёны, пачуць яе галасы. Засталося зусім няшмат – пайсці ў бібліятэку альбо ў кнігарню і спытаць томік вершаў сучаснага гродзенскага (ваўкавыскага, слонімскага) паэта. Гэта было б вельмі лагічна і патрыятычна. Менавіта такая думка прагучала ў фінальным творы мерапрыемства – вершы Людмілы Кебіч «Чытайце гродзенскіх паэтаў!». І сапраўды, чытайце.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** у Гродне адзначылі Сусветны дзень паэзіі. Ініцыяванае Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі літаратурна-музычнае свята пад назвай «Паэзія – мой лёс і вырай», яго ўдзельнікі і госці. Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. 21 сакавіка 2023 года.













Аліна Сабуць



Браніслаў Ермашкевіч



Людміла Шаўчэнка



Эмілія Хацук



Віктар Кудлачоў



Дзмітрый Радзівончык



Ангеліна Жыдзіс


Ганна Скаржынская-Савіцкая


Мікалай Іваноўскі


Анатоль Апанасевіч


Руслан Казлоўскі


Кацярына Каламійцава-Ігнацюк


Надзея Салейка





Таццяна Лугавая



Людміла Нідрагайлава



Аляксандр Сявенка



Людміла Мілоста



Ірына Полудзень






Вікторыя Іванова









**Фота** *Анатоля Апанасевіча і Аліны Сабуць*